# БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 15. Менск. Серада 10 красавіка 1918 г. Год I


*Менск 10/IV.*

## Мястэчкова-вясковая джержава.

Наш край гэта тыповы край мястэчак, вёсках. На фабрыках знаходзіцца толькі 4 чалавекі на 1000 жыцяляў. Рэшта корміцца з зямлі: мястэчкі кормяцца з гандлю дарамі земляробства, рамесламі.

Фундамант краю—воласьць, гэта кавалак тэрыторыі 25—15 вёрст діамэтрам, з 10—15 тысячамі жыхароў і бюджэтам у 4—6000 рублеў. У сярэдзіне воласьці ляжыць мястэчко—горад, населення яго каля 50—70% гэбрэі, гэта торговы стан, у каторага эўрапэйскі спосаб гандлю, которы у Беларусі стаіць высока. Мястэчко гэта цэнтр культурны, адміністрацыйны і торговы.

Мястэчко і воласьць упраўляліся законамі нікуды нягоднымі; суда ні было. У 5 губэрнях беларускіх разам с Ковенскай 1008 валасьцей. Вось фундамэнт нашаго краю.

Трэба арганізаваць добрае валаснoe і мястэчковае самоўпраленне, па закону, каторы падхадзіў бы к эканамічнаму, палітычнаму, бытавому, гістарычнаму і традыцыйнаму складу беларускай правінцыі.

Закон Кэрэнскаго аб воласьці мае адну добрую старану—дэмакратычнае выбарное право. Гэта право ужо укаранілося: ўся воласьць, усе жыцялі, кабеты, дзеўчаты прымалі блізка да сэрца інтарэсы роднаго «горызонту свайей званіцы».

Нам прышлося быць на перших сходах, яны былі заменяны у самым начатку «большэвіцкімі» саветамі с товарышоў, і гэта прывяло Беларусь да анархіі. 42 сэнатары у сітках вельмі сур'езна стараліся зрабіць парадак, ... «каб лясы ні глумілі, каб двароў ніразбіралі, каб завясьці штрафы, а то будзе голад».

Але палажэнне было такое, што прынудзіцельнаго апарату, як паліцыя і суд, саусім ні было, бушавала салдацкая анархія. Салдаты ні далі зрабіць парадку.

Справядлівасьць патрабуець сказаць, што мужыцкія выбарныя—камісары, рабілі аграмадную працу для парадку, самым дабрасовестным спосабам. Можэ дзякуючы гэтаму ні усё была спаляно, высячэно, зрабовано. То выбарныя абходзяць усе хаты і мерацъ сколькі у каго дроў высячэна, каб ні бралі лішняго, то выбарныя аднэй вёскі правераюць сколькі ёсць лішняго хлеба у суседняй весьцэ, а тыя у іх для узаемнаго кантролю.

Сэнатары валасныя і сталыя селяне трымаліся дзержаўна-гаспадарскаю пагляду, але часьць вёскі выхаваная у безпраўю супыняла іх працу.

### Округі.

Цяпер на валасьцях, ужо пры немцах, як нам ведама, валасныя сэнатары ізноў варнуліся да працы, пасьля перарыву ў 3 месяцы. Яны прынімаюць прынцып каоліцыі, каптуюць інтэлігенцыю і памешчыкаў; калі у іх будзе апраудзі—цэльны апарат, яны крута завядуць парадак. Анархія іх зрабіла мудрымі. Трэба толькі давясьці павятовы адміністрацыйны суд і міравыя суды па мястэчках.

Беларус—земляроб з натуры консэрватар і законнік. Паміж валасцю і местам трэба зрабіць іншэ округ с 3—4 валасьцей, эканамічна зьвязаных каля аднаго цэнтру. Часьць функцій агульна-адміністрацыйных, падатных, мэдыцынскіх, вэтэрынарных, вышэйшых школ і спэцыальных школ павінны перайсьці туды. Менш будзе расходу на валасных чыноўнікоў—спецыялістоў, і па сілам будзе завадзіць сярэдніч школі, бальніцы.

### Павет.

Трэба павялічыць лічбу паветаў і перакроіць іх так, каб яны былі натуральнымі і эканамічнымі цэнтрамі. Расійскі закон аб павятовым Земстве гадзіцца для нашых варункаў.

### Губэрнія.

Усе павятовыя земствы да вайны ёшчэ, дамагаліся каб закрыць саусім губэрнскае земство. На нашай думцэ, замест губэрнскіх цэнтраў трэба зрабіць адзін краевы адміністрацыйна—гаспадаркі цэнтр. Навесты могуць злучацца на 2—3 для некаторых агульна сацыальна-экономічных патрэб.

## Усход і Захад.

Нідаўна на пасядзэні Беларускае рады прэдстаўнікі нацыянальных меньшасцяў і земства былі проці незалежнасьці Беларусі, бо гэта, як яны гаварылі ні карысна для беларускаго селянства, каторае зямлю можа дастаць толькі з рук маскоўскаго ураду. Прэдстаўнікі земстваў нават пакінулі сабранне. Гаварылі яшчэ, што беларусы культуру могуць браць толькі з Расеі.

Патрэба нам нізалежнасці з эканамічнаго і культуральнаго боку ні была саўсім асьвечана.

1. Жыццё народаў цяпер кіруецца ні сымпаціямі, а гаспадарскаю карысцю. Кожны з нас вельмі любіць свайго брата, але калі ён кепскі майстар, то звернецца ні да яго, а да чужынца, каторы можа лепей зрабіць якую рэч.

Фактычна ні толькі Беларусь, але і уся Расія была калёніяй нямецкаю. Дзеля сваіх кепскіх тавараў яна шукала рынкаў за тысячы вёрстаў у Сярэдняй Азіі і Манджурыі, а сама была рынкам гэрманскім. Хацела Расія стаць рынкам сама дзель сібе, але вайна паказала, што на гэта яна ні здольна, і калі яна ні будзе рынкам нямецкім, дык ангельскім, амэрыканскім ці французскім.

Асабліва наш край як быў, так ёсць і надоўга застанецца рынкам нямецкім, бо тавары з Лодзі, з Беластоку гэто былі тавары нямецкіх хвабрык.

Але юрыдычна (палітычна, як кажуць) на паперы мы залежалі ад Велікае Расеі, плацілі расейскім чыноўнікам жалаване і давалі на убой салдат. Цяпер і гэтая юрыдычная звязь парвалася. Німа ні якае заўфаласці да Расіі. Калі Беларусь будзе пад Расіяй і начнецца вайна Масковіі з немцамі, дык яна зноў вытапча нашую зямлю, а калі будзе пад уплывам Гэрманіі,—яна ні дасць спустошыць нашую старонку.

2. Велікарасія узяла на сябе манаполію па азнаймленю нас з заходняю культураю—німецкаю. Такім парадкам мы, жывучыя абок з немцамі, павінны былі глядзець на усход, каб убачыць заходнюю культуру.

Калі Петр прасекаў вакно ў Эўропу, дык ён ні хацеў культуру браць з рук пасрэднікаў палякаў, хацяж польская культура шмат вышэйшая была за Масковскую. Так сама і мы ні хочам мець пасрэднікаў. Мы будзем браць культуру проста адтуль, дзе яна найвышэй. Чэхі і балгары так робяць, і культура іх вышэйшая ад расійскай. Можна шмат абецаць і нічога ні даць. Абецалі землю народу, але чы дадуць і калі дадуць, дык чы будуць гарады, асабліва на першых часах, мець хлеб. Апроч таго ні Маскоўскімі ніумелымі рукамі правесці у жыцце вялікія сацыяльныя лёзунгі. Гэта можа зрабіць народ зарганізованы, дысцыпліпірованы, з высокаю тэхнікаю.

**А. Д.**

## Скрыпты шовіністы.

...„Пані Коллонтай выйшла у адстауку, пакінуушы пост каміссара апекі“... «Кажуць, шта гэта знайходзіцца у звязку з арэштам яе мужа, быушаго каміссара Дыбенко»...

„Ульянова назначаецца замясьцелем каміссара прасьветы у Маскоускім округу“. «Кандыдаткай на пост, займаны п. Коллонтай займець жонка Леніна».

Калі да гэтых сьвежых газэтных вестак дадаць ішчэ што жонка «главковерха—Крыленко—п. Крыленчыха была главковыдауцам нябошчыцы «Акопнай Прауды», у якую спрытна закопывала сотні тысяч «керэнскіх і царскіх“, то прыходзіш да высноуку, што бальшэвіцкая улада з натуры свайей мае матрымоніяльны характэр. Усе пары: Крыленко—Крыленчыха, Ульянау—Ульянчыха, Дыбенко—Дыбенчыха—Коллонтай...

Яно і выгадней прауда, але для каго?...

* * *

«Абластны камітэт партыі с.-р., ні разделяючы палітыкі беларускіх арганізацыяу у пытанню аб нізалежнасьці Беларусі, адазвау сваіх предстаунікау... п.п. Мокрэева, Злобіна и Белкинда“...—Так сама з газэтау—Мінскіх.

Цікау я ведаць дзе знайходзіцца гэты «областной комитет». Бальшэвікі, так сама ні згодныя с палітыкай беларусау, зрабілі свой «комитетъ сѣверо-западной области» у Смаленску, аткуль «областью“ мае правіць «таварыш» Вашкевіч. А «область» «т. т.» Мокрѣева, Злобина и Бѣлкинда—дзе яна? Калі усе ішчэ у Мінску, дык валікая шкода, што яе ні адазвау адгэтуль цэтральны камітэт куды нібудзь у Маскву, Петраград, Разань. .

Там для «области» будзя шырокае поле для працы,—уся разваліваючаяся Расія—а тут... Беларусь будуецца!—„Стѣснительно!“

Тым болей, што лоно усіх гэтых абласьцеу—земсаюз—ліквідуецца.

«Мінчанін Янко Лапацон»...—(Мінская газ.).

Нішто сабе прозьвішчо для беларуса... Зграбна!

**А. Новадворскі.**

## Агульныя вэсткі.

— Прапазыцыі ангельскаго ураду у справе павялічэння арміі на гэтым тыдні маюць стацца законам. Урад будзе дамагацца вялікіх уповажнення. Ен маніцца зрабіць сьціслую рэвізыю на ўсіх фабрыках каб выкрыць там здольных на фронт мушчынаў. Апошнія баданія адкрылі цікавы стасунак паміж номінальнай і фактычнай лічбамі людзей на фронце.

— На сходзе мэталічнікаў, карабельных цесьляў і прэдстаўнікоў профэссыянальных зьвязкаў у Лёндане прынята пастанова, у якой гаворыцца, што пабуджаныя утрыманнем ангельскіх войск на заходнім полю бітвы, работнікі ўсходнягопабярэжжа Англіі абяцаюцца зрабіць усё, што толькі у іх сілах, каб выраблаць болей гармат, болей караблёў, больш гранатаў і інш матэрялаў.

— «N. Kowesp.» паведамляе з Нью-Іорку, што сэнатар Кінг зрабіў у сэнаце прапазыцыю аб тым, каб злучоныя Штаты зараз-жа аб'явілі вайну Балгарыі і Турцыі.

———

Паведлуг паведамлення «Morning Post» лічба вайсковых часьцей новай расійскай арміі няведама, але іх ні многа. Камандуюць быўшые ахвіцэры. Прынцыпы арганізацыі новай арміі: ніякой палітыкі!, агульная ваенная павіннасць, жалезная дысцыпліна і кара сьмерцю.

— Чырвоны хрэст звярнуўуся с просьбаю да савецкаго урадру, каб царскай сьм'і у катоаай ёсьць хворые ап... салдоцкай порцыі дявалі д... датк выя харчы.

# БАЖАННЕ.

Ляцяць і ляцяць дні за днямі, як хмары,
Ляцяць і ляцяць нівядома куды.
На сэрцы-ж, на бедным, ўсё цяжкія мары
І сохне яно і баліць ад нуды.
Баліць яно, вяне, як траўка у полі
У восянь. Ніхто й ніспытае цябе
«Чаго ты сумуеш?» Нат мані ніколі
Іншэ ні прыцісну̀ла шчыра к сабе.
І людзі увагу ка мне ні звярталі,
(Пазнаў я ўсю іхнюю подласць і злосць)
Як хлеба прасіў даць, дык камянь кідалі,
А не, то зацьвіўшую голую косць.
Бо што-ж, я радзіуся на сьвет сіратою
І мусіць памру так у цяжкай нудзе.
Ніхто ні заплача праўдзівай сьлязою,
Як буду ляжаць я на дошках уў куце.
А ўсеж бы хацеў я, хоць нудзячы сьветам
Памерці у роднай сваёй старане,
У бедным неродзе замучэнным гэтым,
Каторы мне ровян і міл гэтак мне.

**Нівядомы.**

# С Польчшы.

**Адозва новаго польскаго ураду.**

Новы польскі урад у складзе п. п. Стэчкоўскаго, Ходзько, Дзержбіцкаго, Гігерсберга, Понікоўскаго і Стэцкаго 5 красавіка уступіў у споўненне сваіх абавязкаў. З прычыны гэтаго ім выдана адозва, у якой новы урад паведамляе аб задачах якія ён лічыць перед сабой пастаўленымі.

Першай задачай яго будзе стваранне народнаго прэдстаўніцтва, якога покуль што німа. Для гэтаго як найхутчэй будуць прыняты заходы, каб склікаць Раду паньства, як пераходны законадаўчы орган, за помачу каторага будуць утворэны варункі для ніадкладнаго склікання Сойму, што павінно зрабіцца тым пільней, ў віду развіцця міжнародных стасункаў.

Урад займецца так сама утварэннем польскаго войска, карыстаючы пры гэтым і с тых корпусоў, якія былі выдзелены з рускай арміі і знайходзяцца цяпер за граніцамі Польшчы.

Разумеючы сваё заданне як найперш адбудаванне польскай дзержаўнасьці, урад прыступіць зараз-жа да арганізацыі польскай ўлады і адміністрацыі с тымі часовымі аграничэннямі на карысць акупацыйных ўладаў якія вымагаюцца вайною. Урад будзе старацца, каб польскія установы сваёй справядлівасьцю і спраўнасьцю з'еднялі агульную пашану і будзя апекавацца над інстытутам самапраўлення, у перакананню што яны—найлепшая школа грамадскаго жыцця, аснова дзержаўнаго будынку і разсаднік творчай энэргіі.

Адбудаванне і паднясце на мажліва выжэйшы стопень за помачу джержаўнаго крэдыту прамысловасьці, зварот выкінутых у часе вайны з краю грамадзян—так сама будуць занімаць першае мейсцо ў чыннасьці ураду. Урад прыгатуе для законадаўчаго органу праэкт аграрнай рэформы. Асновамі яе маюць быць: упарадкованне сельскіх стасункаў і залажэнне трывалых асноў для культурнаго і гаспадарскаго развіцця дробнай ўласнасьці і адкрыцце беззямельным магчымасьці зрабіцца ўласьнікамі зямлі праз парцэлляцыю держаўных маёнткаў і даступны крэдыт.

— Вярнуўшыся у Польшчу д-р С. Кэнтрынскій б. гл. ліквідацыйнай камісіі па справам звароту з Расіі у Польшчу вырабаў артыстычнаго штукарства, бібліотэкаў і архіваў, вывязяных туды у працягу апошняго сталецця, паведамляе, што ліквідацыйная камісія апрацавала спіс гэтых рэчаў, каторага скончыць аднак німагла дзеля свайго скасавання.

— Руская інтэлігэнцыя і вучоные надта ніпрыхільна адносяцца да справы аб звароце, і вывязеныя некалі *ніпраўна* рэчы—цяпер можна будзе забраць толькі прэдставіўшы дакумэнты. Гісторычные довады пры гэтым бэз праўных дакумэнтаў пад увагу брацца ні будуць. Датыча гэта больш артыстычна-штукарскіх рэчаў і бібліотэкаў. Архівы можна будзе вывясьці лацьвей, на сколькі на іх жа ні будзя прэтэнсіяў з боку літоўцаў, украінцаў, некалі злучаных с Польшчай. Шмат актаў, аднак нішчыцца праз панующае цяпер у Расіі верхавенство цемнаты.

— На сколькі аднак буржуазны расійскі урад праціўіуся звароту Польшчы гэтаго культурнаго мення, настолькі соцыялістычны урад мала гэтым інтэрэсуецца. Дзеля тэтаго трэба цяпер як найхутчэй правясьці усю гэту справу.

# МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

**Почта,** дзякуючы старанню Губэрнскаго Земства, хутка пачне ужо хадзіць, але толькі для перасылкі службавых пакетау. Ані лістоу, ані газэт, ані грошау прыватным асобам пасылаць усе роуна нельга будзе.

У скорасьці мае наладзіцца гарацкая почта. У Расію —лісты можна пасылаць праз нямецкае бюро карэспандэнцыі (Захарауская, 87); лісты не павінны быць заклеяны і аплачывацца па 30 кап. за кожны.

Пачтовые чыноунікі, страціушы надзею атрымаць тут якую колячы службу, што раз больш і больш выежджаюць у Расію.

———

**Губэрнскае прысутство** хоць і лічыцца афіцыально атчыняным, але дагэтуль німае нат свайго памешкання: дзе перш займало губэрнскае прысутства—туды цяпер ні пушчае яго акружны суд.

Член прысутства Кавалеускі робіць стараннє, каб адчыніць ішчэ адзін аддзел—выкупначыншовы, аб чым падау даклад нямецкаму начальству. Аддзел гэты мае вялікае значэнне, бо да яго належуць сэрвітутныя справы, зямельныя—духавенства і інш.

———

**Курсы Украінскай мовы** пачаліся у Украінскай Грамадзе (Юр'еуская 16) з 2-го красавіка.

———

**У гарацкім Харчовым Камітэці** вывешана абвестка, што картофлі для прадажы больш німа.

———

**Пэнсіанэрам** губэрнскае казначэйства заявіло што дзеля нехвату гатоукі, поуныя пэнсыі пачнуць выплачываць ні раней, як с 1-го мая.

———

**У Кансысторыі,** усе дакументы каторай у 1915 г. вывязены былі у Калугу, некаторыя спыняюцца, як, прымерам, назначэння, прычтовыя будовы і інш., а гэта кепска адбіваецца на агульнай рабоце.

———

**Тры паветы Мінскай губерніі**—Мазырскі, Пінскі і Рэчыцкі, не зважаючы на тое, што іх далучылі да Украіны, у справах духавенства, і з усімі сваімі духоуными інтарэсамі зьвертаюцца да мінскаго епархіяльнаго начальства—у Менскую кансысторыю і да епіскапа Георгія.

———

**У акружным Судзе** 18-го красавіка адбудзецца першае засяданне у цывільных справах.

———

**У Гарадзкую Управу** зноу вярнууся на сваю старую службу—памошніка сэкрэтара—быушы апошнімі часамі (да назначення юрыста Андрэява) сэкрэтаром п. Позьняк—стары знаемы быушаго тутэйшаго губэрнатора Гірса.

Пачалася у Гарадзкой Управе чыстка і жаночаго пэрсаналу, с паміж каторых шмат есьць непатрэбнай і некарыснай лішніцы, а тымчасам з'яуляюцца яны вялікім цікарам для гарадзкой касы.

———

**Скарбовай Палаты** некаторые служачые, дзеля неяснасьці свайго палаження, хацелі б выехаць у Расію, але цяперашні тымчасовы заведуючы скарбовай палатай Смірноу не згаджаецца на гэты выезд, кажучы, што яму патрэбны рабочыя рукі. Тымчасам працаунікам гэтым плацяць усяго палову пэнсіі, а жыць трэба.

———

**Цэнтральны склад упраулення дарожных работ пры Х арміі,** прышпіляны падчас акупацыі да Гарадзкой Управы, за згодай яе,—хацеу прадаць усе свае дабро за 200.000 р. быушаму заведуючаму цэнтральнымі складамі зем. саюзу заходняго фронту у Смаленску п. Леукову; але у гэта умешауся ваенно-палявы кантроль, каторы ні дапусьціу гэтай опэрацыі.

———

**Пры кожным судзьдзі** участковым, падчас разбору спрау, будуць заседаць ішчэ па два члены міравога з'езду. Гарадзкая Дума на першых сваіх заседаннях маніцца выбраць гэтых 12 чалавек, якія будуць аседаць і у камэрах, і у паветовым з'ездзе.

———

**Почтово-тэлеграфныя чыноунікі** з Менску найбольш выежджалі у Смаленск, але цяпер Смаленскі почт.-тэлегр. вокруг так перэпоуніуся, што німа куды там дзецца. Маскоускі і Екатерынаслаускіе вокругі ішчэ раней запоуніліся пачтовікамі—бежанцамі з другіх губэрній, так што цяпер менскім уцекачом трэба шукаць новых сабе мейсц.

**Нарада Народнай Прасьветы пры Губэрнскай Управе** 6-га красавіка разглядала справы: 1) аб краевым унівэрсытэці, 2) аб кніжным складзі і 3) аб выданні кніг.

Прызнана, што пакуль патрэбны унівэрсытэт, а ні выжэйшая спэцыяльная школа, але у гэтым року ніяк ні можна адчыніць нат аднаго, факультэту, бо німа ні грошэй ні прафэсарау, ні кніг, але згадзіліся залажыць фонд на атркыцце унівэрсытэту і асыгнаваць ад Губэрнскаго Земства 100.000 рублеу, а ад паветовых—па 50.000 рубл. на першы раз. Апрача таго павінна быць ініцыатыуная група дзеля аткрыцця унівэрсытэту,

Што да выдавецтва, то расійскія, польскія і жыдоускія кнігі можна дастаць па другіх гарадох. Беларускія—ж кнігі можна атрымаць з Вільні; рэшту выдаць у тым ліку, у якім будуць патрэбаваць павятовыя земствы, чы культурныя арганізацыі.

Паміж іншым выяснілося, што у Магілеускай губ. будуць друкаваць кнігі па расійску, але дапасаваны будуць яны да жыцця беларусау.

———

**Сталыя цэны,** якія на заседанні Гарадзкой Думы 8 красавіка пастаноуляны:

| | | |
|---|---|---|
| 1 ф. сланіны | . . | 6 р. |
| » » масла сметанк. | | 8 р. |
| » » » кухэнн. | | 6 р. |
| и цукру | . . . | 1 р. 50 к. |
| » » мяса трэфнаго | | 2 р. к. |
| » » » кашэрнаго | | 2 р. 85 к. |
| » » целяціны | . . | 2 р. — к. |
| 10 шт яяк | . . . | 3 р. — » |
| 1 кв. млека | . . . | — » 75 к. |

———

**У афіцэрскім бюро** атчыняны склад бялізны для патрэбы афіцэрау' Склад гэты перш належау да У. З. С.

Апрача таго у хуткім часе бюро набывае ад гораду фабрыку вырабоу дрэва, даход с каторага мае ісьці на карысць бяднейшых афіцэрскіх сямействау.

У будучыне—апеку над бяднейшымі афіцэрскімі сямействамі мае узяць на сябе гарадзское самаупрауленне.

———

**Арэндары архірэйскіх зямель** пачалі самі кратацца. аб выплаце належнай зацягнуушайся арэнды і усе гэтыя справы, як відаць, наладзяцца дамовым способам.

———

Рэдактар **А. Прушынскі**

Выдавецтва **Т-во «Заранка»**.



Друкарня Я. А. Грыне́лита.